Источник: “Звязда” – 2020-06-02

# Як зазірнуць у рукапісы класікаў?

Якія каштоўнасці захоўвае Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва?

## Візітоўка юбіляра




Сёння гэта ўстанова з'яўляецца сапраўднай культурнай скарбніцай. За 60 гадоў існавання Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва сабраў больш за 520 фондаў і калекцый. Яны створаны на аснове асабістых архіваў выдатных асоб, а таксама дакументаў творчых саюзаў, выдавецтваў, тэатраў, рэдакцый часопісаў і газет, Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні, кінастудыі «Беларусьфільм», Белдзяржфілармоніі, Беларускай акадэміі музыкі і іншых. Напрыклад, тут можна папрацаваць з асабістымі архівамі і зборамі пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, А. Адамовіча, М. Гарэцкага, В. Быкава, У. Караткевіча, кампазітараў А. Багатырова, Г. Вагнера, Я. Глебава, В. Залатарова, Ю. Семянякі; акцёраў і рэжысёраў Г. Абуховіч, А. Кістава, А. Клімавай, Г. Макаравай, П. Малчанава, Б. Платонава, К. Саннікава, С. Станюты, У. Уладамірскага, Р. Янкоўскага; спевакоў Л. Александроўскай, І. Балоціна, С. Друкер, М. Забэйды-Суміцкага, Р. Млодак; мастакоў і скульптараў І. Ахрэмчыка, В. Волкава, А. Глебава, А. Грубэ, А. Кашкурэвіча, А. Марыкса, С. Селіханава, А. Тычыны і многіх іншых.

Архіў-музей захоўвае рарытэты, датаваныя XIX — пачаткам XX стагоддзя. Гэта рукапіс другой часткі «Беларускага архіва старажытных грамат», падрыхтаваны І. Грыгаровічам (1825 год); рукапісная «Беларуская хрэстаматыя» 1889 года, якую «сабраў і ўлажыў Браніслаў Эпімах-Шыпіла»; запісная кніжка сям'і Кастравіцкіх, у якой захоўваліся лісткі з аўтографамі паўстанцаў 1863 года (спачатку яна належала дзеду, пасля бацьку і нарэшце пісьменніку, мастаку, грамадскаму дзеячу Казіміру Кастравіцкаму — Карусю Каганцу); біяграфічныя дакументы Цёткі; рукапісны часопіс беларускіх студэнтаў-народавольцаў «Гоман» (1884); ліст М. Шагала свайму настаўніку Ю. Пэну з Парыжа (1927—1928) і іншыя дакументы. Сярод многіх унікальных кніг і выданняў, якія захоўвае архіў-музей — газеты «Наша доля», «Наша ніва», «Вольная Беларусь», «Звон»; часопісы «Маладняк», «Узвышша»; стараверская перадрукоўка Псалтыра 1645 года, выкананая ў 1849 годзе, восем выданняў (пачынаючы з 1898 года) паэмы «Тарас на Парнасе», першыя выданні твораў М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа,кнігі В. Ластоўскага, Я. Лёсіка і многія іншыя.

У музейным фондзе каля тысячы прадметаў дзеячаў літаратуры, культуры, мастацтва: вазы, карціны, фалерыстыка (узнагароды), строі, якія належалі выканаўцам народных песень, тут набярэцца цэлая калекцыя друкарскіх машынак і гадзіннікаў, захоўваюцца музычныя інструменты В. Яфімава, М. Шнэйдэрмана, В. Скорабагатава.

Адным з найбуйнейшых сховішчаў дакументальных крыніц па гісторыі літаратуры, выяўленчага мастацтва, тэатра і музыкі Беларусі карыстаюцца айчынныя і замежныя даследчыкі. БДАМЛМ супрацоўнічае з многімі беларускімі і замежнымі ўстановамі, удзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, выдае дакументальныя зборнікі.

## Гісторыя

Доўгі час у Беларусі архіўныя ўстановы не камплектаваліся асабістымі архівамі, унікальныя дакументы, фатаграфіі, рукапісы, рэдкія выданні, што захоўваліся ў прыватных уладаннях, маглі гінуць. Шмат рукапісаў ляжала ў шафах літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет. Шафы бясконца папаўняліся і паўстала пытанне, што з гэтым рабіць, бо такія зборы нельга было аднесці да афіцыйных дакументаў, але ж яны мелі каштоўнасць — так і з'явілася думка аб стварэнні спецыялізаванага архіва. 9 чэрвеня 1960 года такая ўстанова была створана пастановай Савета Міністраў БССР.

У гэтым жа годзе ў межах узаемаабмену дакументамі паміж нацыянальнымі рэспублікамі ў Беларусь паступіла частка архіўных дакументаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча, створанага калісьці ў Вільні. Дзякуючы старанням братоў Луцкевічаў былі захаваны вельмі значныя часткі асабістых архіваў Цёткі, Тарашкевіча, Ластоўскага, Жаўрыда, асобныя рукапісы Купалы і Коласа, Бядулі, Канстанцыі Буйло і многіх іншых. На вялікі жаль, гэты музей быў ліквідаваны ў 1945 годзе, а яго архіўныя фонды падзелены, частка з іх засталася ў Літве.

Пачалося выяўленне крыніц камплектавання дакументамі асабістага паходжання. Архівісты шукалі спадчыннікаў, хто мог валодаць такімі дакументамі, працаваць непасрэдна з самімі фондастваральнікамі — старэйшымі пісьменнікамі, кампазітарамі, мастакамі. Але людзі гатовы былі перадаваць не толькі дакументы, але і рэчы. На той час творчых музеяў было няшмат. І архівісты ўзялі на сябе абавязак збіраць і рэчы, якія належалі вядомым, выдатным асобам і ў будучым маглі б дапоўніць, упрыгожыць любую музейную калекцыю. У 1976 годзе была прынята пастанова Савета міністраў, падмацаваная рашэннем ЦК КПБ (па ўспамінах старэйшых супрацоўнікаў, сам Пётр Машэраў да гэтага прычыніўся), па стварэнні архіва-музея. Нават была задума падабраць у горадзе будынак з выставачнымі заламі, але яна не рэалізаваная і дагэтуль. Установа так і засталася музеем-сховішчам, але яе скарбы запатрабаваныя. Напрыклад, у БДАМЛМ захоўваюцца асабістыя фонды мастакоў, эскізы для многіх вядомых карцін. Так, сама работа Волкава «Мінск. 3 ліпеня 1944 года» знаходзіцца ў экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея, а эскізы дэталяў, герояў карціны і дакументы мастака зберагае Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Дзякуючы копіям і муляжам, зробленым на аснове захаваных тут скарбаў, многія музеі (у тым ліку краязнаўчыя, школьныя) могуць папаўняць свае экспазіцыі, ствараць часовыя выстаўкі.

## Некранутая спадчына?

— Пошук і збіранне каштоўных дакументаў ніколі не спыняецца?

— Мы працуем з дакументамі, якія да нас паступаюць, вывучаем адрасы на канвертах карэспандэнтаў, чытаем успаміны, газетныя публікацыі, сустракаемся з людзьмі, якія былі знаёмыя з дзеячамі літаратуры і мастацтва, могуць даць нам адрас пэўнай крыніцы, — расказвае дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея Ганна Запартыка. — І гэтыя пошукі не толькі ў межах Беларусі. Сёння многа фондаў, якія створаны дзякуючы захаваным асабістым архівам, сабраным, па сутнасці, з усіх рэспублік былога СССР. Яшчэ ў 70—80-я гады архівісты многа падарожнічалі, перапісваліся, атрымлівалі дакументы. З Яраслаўля прывезлі рэчы і архіў сям'і Багдановіча, з Саратава — архіў Язэпа Дылы, з Ташкента — Сцяпана Ліхадзіеўскага, з Масквы — Адама Бабарэкі, Аляксея Каўкі, Ларысы Аляксеевай. З Санкт-Пецярбурга паступіў унікальны, адзін з самых вялікіх, архіў Лукаша Бэндэ, дзе ёсць уласныя рукапісы, фатаграфіі і асабістыя дакументы і цэлая калекцыя сабраных ім дакументаў дзеячаў літаратуры і мастацтва ад сярэдзіны XIX стагоддзя да 1940-х гадоў. Там ёсць копіі і шмат арыгіналаў, рукапісы Максіма Гарэцкага, Паўлюка Труса, Аркадзя Куляшова і многіх іншых. З Латвіі прыйшлі архівы паэта Пятра Сакола, з Польшчы — Сакрата Яновіча, Юрыя Туронка. Былі паступленні з Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў,

Аўстраліі. Трэба выказаць удзячнасць усім, хто нам дапамагае камплектаваць фонды, — Вітаўту Кіпелю, Янку Запрудніку, Адаму Мальдзісу.

— Дзякуючы архіву можна ўбачыць творы пісьменнікаў, некранутыя цэнзурай. Ці моцна яны могуць розніцца ад таго, што было надрукавана?

— Такім узорам несупадзення можа быць, напрыклад «Эпитафия без елея. Страницы воспоминаний партизана» літаратуразнаўца Навума Перкіна. У свой час успаміны друкаваліся, але былі моцна адцэнзураваныя, арыгінал вельмі пацярпеў. У 2013 годзе з нашага архіва ўзяты арыгінал рукапісу і выдадзены. У зборніку «Над хвалямі Серабранкі», які падрыхтаваны дзякуючы асабістаму архіву Івана Козела, некаторыя з яго п'ес можна пабачыць упершыню. Інстытут літаратуры пры падрыхтоўцы збору твораў абавязкова працуе ў архіве. Важна прасачыць тэксталагічныя змены, абазначыць у каментарыях, гэта неабходна для спасціжэння творчай лабараторыі пісьменніка. Зараз супрацоўнікі Інстытута літаратуры працуюць з фондам Янкі Брыля, раней такая работа вялася з фондамі Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, Івана Мележа.

— На які час яшчэ даследчыкам хопіць работы з архіўнымі дакументамі? Якія тэмы наогул не раскрытыя?

— Калі я прыйшла ў архіў на работу адразу пасля вучобы ва ўніверсітэце, адчула, як мала мы ведаем пра нашу літаратуру. Наколькі яна была «шматнаселеная»! Мы мелі не толькі магутны лес, але і падлесак, які не паспеў рэалізаваць свае магчымасці, талент. Адным аўтарам перашкодзілі рэпрэсіі, другім — вайна. Калі Янка Брыль гаварыў, што ў яго было пасведчанне пісьменніка пад нумарам 6, ад гэтага станавілася крыху жахліва. Ці хто задумваўся, чаму пісьменнікаў было так мала ў пасляваенны час? Калі мне трэба было заглыбляцца ў праблемы камплектавання, чытаць даведнікі і бясконца ўдакладняць біяграфічныя звесткі, я раптам заўважыла, што многія пісьменнікі апынуліся на новабудоўлях Сібіры, Далёкага Усходу, Поўначы. Многія з іх не былі ўзноўлены ў членстве Саюза пісьменнікаў, хоць у тыя часы гэта было вызначальным, але архівісты стараліся як мага болей захаваць, наш музей-архіў камплектаваўся і такімі фондамі. Пра многіх асоб сталі ўспамінаць толькі ў канцы 80—90-х гадоў. Сёння іх імёны вядомыя. Іх фонды ёсць у нас, яны запатрабаваныя даследчыкамі, тымі, хто вывучае гісторыю літаратуры, працуе ў акадэмічных інстытутах, на кафедрах гуманітарных ВНУ, краязнаўцамі. Студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя на базе дакументаў, якія захоўваюць фонды.

Сёння можна разглядаць многія праблемы і пад іншымі ракурсамі. Трэба вывучаць у комплексе ўласна гісторыю, паўсядзённасць, жыццё грамадства на пэўным адрэзку часу, канкрэтную асобу пісьменніка. А гэта і ёсць уплывы на літаратуру, на жанры, на сюжэты і г. д. Калі пачнём ствараць сваю энцыклапедыю лёсаў, разгорнутых, панарамных даследаванняў, мы зможам зацікавіць і сучаснага чытача, і наступныя пакаленні нашай літаратурай. Яна вельмі багатая. Даследаванні павінны быць сучасныя, з улікам тых дакументаў, якія сёння адкрытыя. Літаратура становіцца іншай, але тое, што было ў нашай гісторыі, мы павінны вывучаць: выдаваць кнігі, зборы твораў, каб не забываць, не разрываць гэтыя перыяды, пакаленні.

— Але разрыў адбыўся. Кнігі знішчаліся, часопісы і выданні забіралі з бібліятэк. Многія асобы проста не паспелі выдаць свае творы. Пэўны час мы не ведалі пра існаванне некаторых пісьменнікаў, пэўнай літаратуры. Што сёння робіцца для таго, каб ліквідаваць прабелы?

— У двух тамах, якія падрыхтавалі супрацоўнікі архіва, прысвечаных Адаму Бабарэку, вялікая колькасць рукапісаў апублікавана ўпершыню. Гэта выдатны літаратурны крытык, філосаф, паэт. Ён тлумачыў сучаснаму чытачу творы Кузьмы Чорнага, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Дубоўкі, даносіў нацыянальную ідэйную значнасць.

Да таго, як яго асабісты архіў паступіў да нас, рэдкія людзі маглі бачыць ці меркаваць, што захаваліся працы — не толькі тыя, што выйшлі ва «Узвышшы» ці «Маладняку», але і тое, чаго крытык не змог апублікаваць, пра што толькі марыў. Гэта і тыя тэксты, якія былі напісаны ім у высылцы ў 1930-я гады, перапіска.

У нас ладзіцца многа выставак. На экскурсіі прыходзяць студэнты і школьнікі. Пра кожны з фондаў можна рабіць асобныя перадачы. Мы рыхтуем зборнікі. «Сцежкамі жыцця» — архіў Паўліны Мядзёлкі, вядомай дзяячкі беларускага адраджэння. Пад адной кніжнай вокладкай таксама можна знайсці цэлы архіўны збор Зоські Верас, у свой час яго перадала сама пісьменніца з Вільні. У нас захаваліся выданні 20-х гадоў з працамі Усевалада Ігнатоўскага, дзякуючы чаму мы змаглі падрыхтаваць адпаведны зборнік. Разам з супрацоўнікамі Акадэміі музыкі працавалі над кнігай, у якой сабраны ўспаміны пра Анатоля Багатырова і рэдкія фатаграфіі і дакументы, якія былі перададзены ў архіў яго спадчыннікамі. На падставе нотных рукапісаў, якія знаходзяцца ў розных фондах, выдадзены «Творы беларускіх кампазітараў XIX—XX стагоддзяў».

— Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць вяртаць спадчыну?

— Так, мы працуем з цэлым светам. Калі выяўляем дакументы, якія датычацца жыцця і дзейнасці нашых пісьменнікаў, у дзяржаўным сховішчы іншай краіны стараемся атрымаць электронныя копіі. Копіі могуць паступаць і ад прыватных асоб. Напрыклад, дзякуючы сям'і сябра Уладзіміра Караткевіча Фларыяна Няўважнага, мы атрымалі каштоўныя электронныя копіі. Але сёння на 98 працэнтаў наша праца звязана з папяровымі дакументамі. Зараз разбіраецца агромністы (да 100 архіўных скрынак) фонд Рыгора Барадуліна, апрацаваны фонд Генадзя Бураўкіна. Разбіраецца архіў Ніла Гілевіча. Паступаюць да нас архівы многіх сучасных дзеячаў. Сямён Букчын прыходзіць да нас, можа расказаць багата цікавых гісторый, пракансультаваць. Гэта вельмі добра, калі мы можам працаваць з самім фондастваральнікам. Праца з традыцыйнымі папяровымі дакументамі яшчэ не хутка сыдзе з архіўнай практыкі.